УДК 930.2(476)

# КЛІМАТЫЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ЗІМЫ 1708–1709 гг. У ЕЎРОПЕ

**Субоцін А. А.**
Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт"
(г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь)

Анатацыя. На аснове пісьмовых крыніц і даследаванняў спецыялістаў у сферы гістарычнай кліматалогіі зроблена характарыстыка ўмоў надвор'я зімы 1708–1709 гг. Аўтар адзначае анамальна халодны зімні сезон на тэрыторыі ўсяго еўрапейскага кантынента, а таксама вылучае сацыяльна-эканамічныя наступствы неспрыяльных кліматычных умоў.

Ключавыя словы: клімат, гістарычная кліматалогія, надвор'е, пісьмовыя крыніцы.

Summary. On the basis of written sources and researches of experts in the field of historical climatology the weather conditions of winter 1708–1709 are characterized. The author notes the abnormally cold winter season on the territory of the entire European continent, and also highlights the socio-economic consequences of unfavorable climatic conditions.

Key words: climate, historical climatology, weather, written sources

Сярод актуальных праблем міждысцыплінарнага ўзаемадзеяння ў пачатку XXI ст. асабліва вылучаецца даследаванне пытанняў змен клімату. У гэтым сэнсе на стыку навук паспяхова развіваецца такая дысцыпліна як гістарычная кліматалогія, мэтай якой з'яўляецца вызначанне кліматалагічных характарыстык папярэдніх стагоддзяў на аснове пісьмовых сведчанняў. Аналізуючы разнастайныя пісьмовыя крыніцы, гісторыкі робяць неацэнны ўнёсак не толькі ў развіццё гуманітарных ведаў, але і дапамагаюць прадстаўнікам натуральных навук рэканструяваць кліматы мінулага ў іх разнастайных праяўленнях. Адным з вострых эпізодаў змены клімату падчас так званага Малога ледавіковага перыяду можна лічыць зіму 1708–1709 гг., што лічыцца самым халодным сезонам XVIII ст.

У пачатку студзеня 1709 г. Заходняя Еўропа стала сведкам беспрэцэдэнтнага націску халоднага паветра. Піянер у галіне інструментальнай метэаралогіі Луі Марэн занатаваў раптоўнае змяненне напрамку ветру з паўднёва-заходняга на паўночна-усходні. Халоднае паветра ўварвалася ў выглядзе снежнай буры, выклікаўшы павышэнне атмасфернага ціску і паніжэнне тэмпературы. Антыцыклон з цэнтрам над Батнічным залівам накіраваў палярнае паветра ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу [7, p. 291].

Ледзяное паветра рухалася з поўначы на поўдзень з хуткасцю 40км/г. 6 студзеня яно распаўсюджваецца на тэрыторыю Паўднёвай Францыі і Італіі, а затым раніцай 7 студзеня – на Іспанію. Як адзначаюць тагачасныя пісьмовыя крыніцы, холад усталяваўся такі, што птушкі падалі з неба, кара на дрэвах трэскалася, што характэрна для моцных маразоў. Даволі хутка буйныя рэкі і азёры Заходняй і Цэнтральнай Еўропы пакрыліся лёдам, у тым ліку рэкі Эбро і Тахо на Перынейскай паўвостраве і Венецыянская лагуна. Нават возера Гарда, змешачанае на паўдні ад Альпаў, было пакрыта суцэльным лёдам, што гістарычна ўнікальна. Парты Генуі і Ліворна былі таксама заблакіраваны лёдам.

Як адзначаюць даследчыкі гістарычнай кліматалогіі, зімняя тэмпература 1708–1709 гг. была ніжэй на 5,7 °С за сярэдні паказчык 1961–1990 гг. Напрыклад, у Парыжы студзень быў на 6,5 °С, а люты на 2,2 °С халаднейшы за сярэднія тэмпературы адпаведных месяцаў 1961–1990 гг. [9, p. 219-220].

Холад стаў шокам для тагачаснага грамадства. Многія людзі апынуліся зачыненымі ў сваіх дамах, таму што дзверы былі замарожаны. Людзям даводзілася хадзіць па абледзянелых вуліцах і пастаянна сутыкацца з небяспекай паслізнуцца і зламаць рукі і ногі. Дзяржаўныя ўстановы і тэатры зачыняліся. Улады арганізоўвалі развядзенне велізарных вогнішчаў, каб сагрэць замерзлых пешаходаў. Лізелота фон дэр Пфальц, нявестка французскага караля Людовіка XIV пісала з Парыжу 10 студзеня 1709 г. наступнае: "Я сяджу перад вялікім камінам, дрыжучы ад холаду, хоць на шыі ў мяне сабалінае футра і мядзвежая шкура ў мяне на нагах…Вы ледзь можаце есці ці піць. Віно і вада ператвараюцца ў лёд, нягледзячы на агонь.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Усё, што вы ясцё, замарожваецца…Кожны сядзіць каля свайго каміна, кашляючы і адплёваючыся” [6, s. 78]. Вялікая колькасць людзей і хатняй жывёлы памірала ад холаду. Французкі гісторык Э. Ле Руа Ладзюры падлічыў, ўто колькасць загінулых толькі ў Францыі склала 600 000 чалавек [8, p. 417].

У Паўночным Міжземнамор’і замаразкі знішчылі такія адчувальныя да холаду культуры, як аліўкі і апельсіны. Палі з пасевамі ў Францыі былі пакрыты суцэльным лёдам, што прывяло да катастрафічных неўраджаяў. На вышыні 430 м над узроўнем мора на Швейцарскім плато снежнае покрыва захоўвалася да пачатку сакавіка 1709 г. [9, p. 220].

Пісьмовыя сведчанні пра анамальна халодную зіму 1708–1709 гг. мы можам сустрэць і адносна тэрыторыі Усходняй Еўропы. Так, прадстаўнік двара Пятра I І. А. Жэлябужскі ў сваіх “Дневных записках” наступным чынам ахарактарызваў адзначаную намі зіму ў Расіі: “А морозы были великие, многие на дорогах помирали, также и снеги были глубокие” [1, с. 245]. Экстрымальна халодныя ўмовы надвор’я зімы 1708–1709 гг., безумоўна, былі звязаны з ключавым этапам Паўночнай вайны, калі расійскія войскі вялі баявыя дзеянні на тэрыторыі Украіны супраць арміі Карла XII. У снежні 1708 г., па сведчанні “Походного журнала Петра Великого”, устанавіліся вялікія маразы, падобна якім людзі не памяталі ў папярэднія гады. Ад моцных маразоў загінула немала як шведскіх, так і расійскіх салдат [4, с. 31]. На тэрыторыі Украіны маразы і абільныя снегапады працягваліся таксама ў пачатку 1709 г. Пісьмовая крыніца пад назвай “Летопись или описание краткое знатнейших действий и случаев, что в котором году деялось в Украине малороссийской обеих сторон Днепра и кто именно когда гетманом был козацким” адзначае: “Тогож року малороссияне везде на квартирах и по дорогам тайно и явно шведов били, а иных и живых к государю привозили, разными способами бьючи и ловлячи блудящих, понеже тогда снеги великие были и зима тяжкая морозами, от которых премного шведов погинуло” [5, с. 48].

На тэрыторыі Беларусі пра анамальна халодную зіму распавядае Магілёўская хроніка Сурты і Трубніцкіх, дзе пад 1708 г. быў зроблены наступны запіс: “A za tym nastąpiła zima sroga, łuta ze nie jednemu dała się we znaki” [3, с. 276]. За 1709 г. апісанне хронікай анамальнай зімы працягваецца і адзначаецца, што падчас яе выпалі незвычайна вялікія снягі, а птушкі, звяры і людзі замярзалі на дарогах, таксама згадваецца голад і высокія цэны на збожжа і іншыя прадукты харчавання [3, с. 276].

Пра катастрафічныя ўмовы зімы 1708–1709 гг. у Беларусі сведчаць таксама іншыя пісьмовыя крыніцы. Напрыканцы 1708 г., знаходзячыся ў Пінску, гетман польны літоўскі Міхаіл Сервацый Вішнявецкі занатаваў: “Mrozy haniebnie wielkie” [10, s. 104]. Пінскі шляхціч Францішак Шырма ў сваім дыярыушы адзначаў, што самымі цяжкімі месяцамі зімы былі студзень і сакавік, а незвычайныя маразы прывялі да шматлікіх чалавечых ахвяр, знішчылі жывёлу і расліны [11, s. 125].

Канцлер вялікі літоўскі Караль Станіслаў Радзівіл упамінуў пра надыход адлігі 12–16 лютага 1709 г. у раёне Белай (Брэсцкі павет), дзе вялікія воды пазносілі грэблі і масты. Згодна са сведчаннямі магната, халады вярнуліся 18 лютага [11, s. 125-126]. Як водгалас сямейных успамінаў, перажыванні зімы 1709 г. знайшлі месца ў запісах Міхаіла Казіміра Радзівіла, які расказваў пра сваё знаходжанне ў Тылжы ў сямігадовым узросце ў сваёй маці Ганны Радзівіл, народжанай Сангушкай, у “самую халодную зіму” [2, с. 18].

Такім чынам, гістарычныя звесткі канца 1708 г. – пачатку 1709 г. дазваляюць зрабіць характарыстку зімы гэтага перыяду як аднаго з самых халодных сезонаў з рэкордна нізкімі тэмпературамі, моцнымі вятрамі і інтэнсіўнымі ападкамі ў выглядзе снегу. У пісьмовых крыніцах апісваліся не толькі агульныя метэаралагічныя ўмовы, характэрныя для адзначанай зімы, але і ўласныя перажыванні тагачасных аўтараў, што вымушаны былі ратавацца ад настаўшых халадоў. Акрамя таго, інфармацыя гістарычных крыніц пра адзначаную зіму дазваляе казаць пра сацыяльныя і эканамічныя наступствы неспрыяльнага надвор’я, калі фактычна пацярпеў увесь еўрапейскі кантынент праз масавае знішчэнне сельскагападарчых пасеваў, дамашняй жывёлы і скарачэння колькасці насельніцтва ў выніку абмаражэння. Кліматычныя ўмовы зімы 1708–1709 гг. таксама стварылі экстрымальную сітуацыю для вядзення баявых дзеянняў падчас Паўночнай вайны.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Дневные записки Желябужского с 1682 по 2 июля 1709. – СПб. : Тип. Императорской Российской Академии. – 346 с.
2. Дыярыюш князя Міхала Казімера Радзівіла // Спадчына. – 1994. – № 4. – С. 18–47.
3. Полное собрание русских летописей / Институт истории СССР. – Москва : Наука, 1980. – Т. 35 : Летописи белорусско-литовские. – 306 с.
4. Походные журналы 1706, 1707, 1708 и 1709 годов. – СПб., 1854. – 104 с.
5. Сборник летописей, относящихся к истории Южной и Западной Руси, изданный Комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. – Киев : Типография Г. Т. Корчак-Новицкого, 1888. – 323 с.
6. Feuerstein-Praßer, K. Liselotte von der Pfalz: Ein Leben am Hof Ludwigs XIV / K. Feuerstein-Praßer. – Regensburg : Pustet, 2016. – 144 s.
7. Kington, J. A. Climate and Weather / J. A. Kington. – London : Collins, 2010. – 496 p.
8. Le Roy Ladurie, E. Histoire humaine et comparee du climat: I. Canicules et glaciers XIIIe–XVIIIe siecles / E. Le Roy Ladurie. – Paris : Fayard, 2004. – 740 p.
9. Pfister, C. Climate and society in Europe – the last thousand years / C. Pfister, H. Wanner. – Bern : Haupt verlag, 2021. – 396 p.
10. Podole, Wołyn, Ukraina. Obrazy miejsc i czasów : w II t. / Aleksandr Przezdziecki. – Wilno : nakład i druk Teofila Glücksberga, 1841. – T. I / Aleksandr Przezdziecki. – 214 s.
11. Wojciuk, M. T. Zjawiska atmosferyczne, elementy meteorologiczne i klęski żywiołowe na Litwie w latach 1697–1763 w wybranych źródłach narracyjnych / M. T. Wojciuk // Rocznik Lituanistyczny. – 2015. – № 1. – S. 115–169.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова